# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА: СУСТРЭЧА АЛЯКСАНДРА СУБОЦІНА З МОЛАДДЗЮ

***80-годдзю са дня трагедыі ў Хатыні і подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны была прысвечана сустрэча актывістаў ВДУ імя П.М. Машэрава з ліку студэнтаў і навучэнцаў Ліцэя са старшынёй Віцебскага аблвыканкама Аляксандрам Субоціным.***

Мерапрыемства адбылося ў рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта БРСМ «Заліковавая размова», які прадугледжвае цыкл сустрэч у фармаце адкрытага дыялогу моладзі і прадстаўнікоў улады, дэпутацкага корпуса, грамадскіх арганізацый, СМІ, палітолагаў для абмеркавання грамадска-палітычных пытанняў.

Рэктар ВДУ імя П.М. Машэрава Валянціна Багатырова, доктар эканамічных навук, прафесар, вітала Аляксандра Міхайлавіча ў канферэнц-зале. Валянціна Васільеўна падзякавала госцю за тое, што ён знайшоў час для размовы з моладдзю, што заўсёды адкрыты для стасункаў і гатовы не толькі выслухаць, але і пры неабходнасці падтрымаць праекты і прапановы.

У сваю чаргу Аляксандр Субоцін адзначыў, што для яго важна атрымаць уяўленне пра



тое, што хвалюе маладое пакаленне сёння, бліжэй пазнаёміцца з таленавітай і актыўнай моладдзю.

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся розныя пытанні. Безумоўна, у першую чаргу гэта тэма трагедыі, якая адбылася 22 сакавіка 1943 года ў Хатыні, калі загінулі амаль усе жыхары гэтай беларускай вёскі. Аляксандр Міхайлавіч шчыра прызнаўся, якія пачуцці ў яго выклікае наведванне месцаў баявой славы, мемарыяльных комплексаў і помнікаў вайны, а таксама падкрэсліў, што ў сучаснай моладзі – гены салдат-пераможцаў і абавязак кожнага памятаць пра страшныя падзеі мінулага, каб не дапусціць іх паўтарэння ў будучым. Старшыня аблвыканкама падрабязна адказаў на ўсе пытанні студэнтаў і навучэнцаў Ліцэя, нават асабістага характару, калі, напрыклад, моладзь пацікавілася, як Вялікая Айчынная вайна закранула яго сям'ю.

Акрамя таго, машэраўцы падрыхтавалі творчыя нумары: песню, вершы ўласнага сачынення, прысвечаныя тэме вайны. А на памяць Аляксандру Субоціну падаравалі альбом з фотаздымкамі і малюнкамі навучэнцаў Ліцэя ВДУ.

Пасля мерапрыемства хлопцы і дзяўчаты не спяшаліся разыходзіцца. Яны абмяркоўвалі, наколькі шчырай, душэўнай і зусім не афіцыйнай атрымалася размова.

**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж з сустрэчы глядзіце з дапамогай QR-кода.